**ДА 85-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭНЬНЯ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА**
**Вольга Іпатава: Успамін пра Ул. Караткевіча**

*Ад рэдакцыі:* Сёлета споўнілася б 85 гадоў жыцьця аднаму з найбольш таленавітых беларускіх пісьменьнікаў – Уладзіміру Сямёнавічу Караткевічу. Ён нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў Оршы.



Уладзімір Караткевіч - класік беларускай літаратуры, які пакінуў заўважны сьлед ва ўсіх жанрах - паэзіі, прозе, драматургіі, публіцыстыцы, перакладзе.

На Вікіпедыі зьмешчаны падрабязныя дэталі жыцьця і творчасьці У. Караткевіча, пачынаючы з паходжаньня і маленства, пасьляваеннага часу, гадоў вучобы і творчасьці ў Кіеве, і часы росквіту яго таленту ў Мінску, яго шчасьце і трагедыю ў шлюбе. Аднак, больш падрабязна можна даведацца аб самім пісьменьніку, чытаючы амаль такія аўтабіяграфічныя аповесьці як “Лісце каштанаў” (пра жыцьцё падлеткаў у Кіеве), “Чазенія” (пра жыцьцё на Далёкім Усходзе), і ў аўтабіяграфічных нататках самаго аўтара.

Найбольш вядомыя творы аўтара:
- аповесці: Дзікае паляванне караля Стаха, Сівая легенда, У снягах драмае вясна, Цыганскі кароль, Зброя, Ладдзя Роспачы, Чазенія, Лісце каштанаў, Крыж Аняліна;
- Раманы: Каласы пад сярпом тваім, Хрыстос прызямліўся ў Гародні, Чорны замак Альшанскі, Леаніды не вернуцца да Зямлі.

Пра Караткевіча створана дакументальная стужка «Быў. Ёсць. Буду» (1989),

відэафільмы «Успамін» і «Рыцар і слуга Беларусі» (абодва — 1991).

Рэдакцыя часопіса “КУЛЬТУРА, НАЦЫЯ” заносіць на свае старонкі імя У. Караткевіча на Дошку нацыянальных герояў.

Ніжэй мы падаём артыкул В. Іпатавай пра знакамітага беларуса.

**Вольга Іпатава: Успамін пра Ул. Караткевіча**

Думаю, што я шчаслівы чалавек, бо жыцьцё падарыла мне мноства сустрэч, знаёмстваў з выдатнымі людзьмі. З некаторымі я сябравала, некаторыя праляцелі, як зоркі па небасхіле, па маім жыцці. Якраз сёння ноччу я доўга стаяла пад зорным небам, бо мусіў быць зоркапад метэорнага патоку Персея, але, мабыць, яго можна было ўбачыць у Еўропе, а не ў Канадзе. Затое тут з асаблівай вастрынёй думаецца пра Беларусь, пра тых, хто быў для мяне прыкладам і натхненнем, хто атуліў мяне клопатам і цеплынёй у мае дзіцячыя дзетдомаўскія гады – такіх, як Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Міхась Васілёк, Данута Бічэль-Загнетава. Пра іншых пісьменнікаў, каго я ведала асабіста і за чыёй творчасцю сачыла – і вучылася ў іх...

Такім чалавекам быў для мяне, як і для маіх равеснікаў па творчасці, Уладзімір Караткевіч.

З самых першых ягоных публікацый – спачатку вершаў, пасля рамана «Каласы пад сярпом тваім», які выйшаў у 1965 годзе, ён стаў несумненным лідэрам пасляваеннага пакалення беларускіх паэтаў і празаікаў, сярод якіх былі такія «зоркі першай велічыні», як Рыгор Барадулін.

Іх, можа, і не варта параўноўваць, бо кожны вялікі па-свойму. Але калі вершы Барадуліна для мяне – як жменя бясцэнных брыльянтаў, якія зіхацяць і пераліваюцца пад промнямі святла, і ты зачароўваешся іх бляскам і дасканаласцю, то «Каласы пад сярпом тваім», як і ўсё, што стварыў Уладзімір Караткевіч, гэта – абуджэньне тваёй геннай памяці, усяго, што ўкладзена ў цябе продкамі. Ты не памятаеш падзей даўніны, ты нават сёння не ведаеш пра многае – але гэта яны, продкі, ішлі па Грунвальдскім полі з дзідамі, баронячы сваю – і нашу! -- незалежнасць, гэта яны ў сівых стагоддзях спявалі жніўныя песні, палілі купальскія кастры і паміралі за волю...

Таму, калі я ў першы раз пабачыла яго ў Гродне, дзе ён выступаў у педінстытуце, я нават не асмелілася падыйсці да яго і загаварыць. Але пазнаёміла нас Данута Бічэль-Загнетава, з якою яны былі ў сяброўскіх адносінах. Яна мяне прадставіла як маладую паэтку, якая рыхтуе сваю першую кніжку. Тут ён, ветліва-няўважлівы раней (ці мала

дзяўчатак і хлопчыкаў ірвуцца да паэта пасля выступлення!) упершыню пільна зірнуў на мяне, як бы ацэньваючы, ці можа што атрымацца з гэтае асобы. І, на маё здзіўленне, запомніў маё прозвішча, бо пасля, на з'ездзе Саюза пісьменнікаў у Мінску, куды запрасілі і такіх пачаткоўцаў, як я, сам падыйшоў да групы гродзенцаў, і яго вітанне было сяброўскім і вельмі дружалюбным.

... Вельмі шкада мне таго дамка каля тэатра Янкі Купалы, у якім да самай пабудовы сённешняга шыкоўнага Дома літаратараў (з якога нас выгнаў Лукашэнка) месціўся некалі саюз пісьменнікаў Беларусі! У ім, калі не памыляюся, быў падарваны Кубэ ў час вайны. Пасля тут атабарыліся пісьменнікі. Дамок гэты быў у меру стары, невялікі, але вельмі ўтульны. Мяне з ім звязвалі першыя незабыўныя ўражанні, калі 15-гадовай дзяўчынкай я ўпершыню прыехала са сваімі вершыкамі ў Мінск, і Янка Брыль, партызанскі сябра маіх бацькі і маці, павёў мяне знаёміць з беларускімі пісьменнікамі. На месцы колішняга Саюза пісьменнікаў цяпер адміністрацыя прэзідэнта, але я заўсёды, калі праходжу па вуліцы К. Маркса, «бачу» той дом і часта ўзгадваю розныя сітуацыі, што адбываліся ў ім, і размовы нашых папярэднікаў – Кандрата Крапівы, Аркадзя Куляшова, Тараса Хадкевіча, Алеся Асіпенкі, Еўдакіі Лось...

І Валодзі Караткевіча.

Кажу «Валодзі» - таму што пасля першага ж звароту да яго у тым дамку як да «Уладзіміра Сямёнавіча» ён катэгарычна запярэчыў:
- Ніякага «Сямёнавіча!» Ты і я – адной крыві! Мы ж паэты!
- Любіце (папраўілася) любіш Кіплінга? - азвалася я.
- А ты яго, аказваецца, таксама чытаеш?
- Я ж філалагіня, мушу гэта ведаць.

Пасля, пры сустрэчах, ён любіў «падначваць» мяне рознымі загадкамі літаратуразнаўства. Ён ведаў фантастычна шмат розных рэчаў. Адукаванасць – гэта адно. Маё пакаленне філолагаў атрымала, думаецца мне, неблагую адукацыю і таму я магла з ім гаварыць амаль на роўных. Але тое, што ён « капаў», што адкрываў у беларускай гісторыі, належала толькі яму.

І таму кожны ягоны твор рабіўся падзеяй у беларускай літаратуры. Спалучэньне грунтоўных ведаў і рамантыкі ў падачы «матэрыялу» рабіла незабыўнае ўражаньне. «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Чорны замак Альшанскі» - яго чытацкая аўдыторыя расла, а разам з тым і іншыя аўтары браліся за гістарычныя тэмы.

Прынамсі, мая аповесьць пра Еўфрасінню Полацкую «Прадыслава» без У. Караткевіча не была б напісаная. Праўда, мала таго што мне дасталася ад партыйнай прэсы, асабліва ад афіцыёзнага гісторыка Л. Абэцадарскага, які ў «Советской Белоруссии» разграміў яе дашчэнту, дык і сам Караткевіч, хаця і пахваліў мае спробы пісаць пра

гістарычныя падзеі Беларусі, усё ж заўважыў, што жанчыны, як правіла, не могуць пісаць гістарычныя творы. Я тады, помніцца, вельмі пакрыўдзілася, і калі чарговы раз сустрэлася з Уладзімірам Сямёнавічам на нейкім пленуме (тады часта праводзіліся розныя пленумы і семінары, дзе можна было хаця б сустрэцца і пагаварыць з мінчукамі), выказала яму гэтую крыўду. Але ён толькі засмяяўся:

- Вас, жанчын, трэба добра раззлаваць, тады вы за справу берыцёся!

І ўсё ж з жанчынамі ён найперш быў рыцарам. Сустракаючыся, цалаваў руку. Мог пры ўсіх стаць на адно калена і паднесці кветку. Я вельмі бянтэжылася. Але ён гэтак жа ставіўся і да Дануты Бічэль-Загнетавай. Ён увогуле неяк па-асабліваму ставіўся да нас, гродзенцаў. Можа, таму, што тонка адчуваў нейкую асаблівую беларускасць «заходнікаў», можа, таму, што Гродзеншчына дала Беларусі Васіля Быкава.

Некалькі разоў мы разам выступалі. Звычайна гэта былі літаратурныя вечарыны ў педагагічных інстытутах – Гродна, Брэсце. Моладзь ад яго проста шалела, і менавіта ён заўсёды аказваўся ў цэнтры ўвагі. Але Караткевіч не любіў выступаць, хаця яго прамовы заўсёды былі вострыя, са свежай думкай і філасофіяй.

Сама яго прысутнасць у нашай літаратуры ўздымала яе, літаратуру, на нейкую новую, высокаінтэлектуальную прыступку. Яго любоў да зямлі, на якой ён жыў, нараджала старонкі, якія і дасюль, калі я чытаю яго, як бы дыхаюць прасторай і гулам вякоў.

Ён шмат падарожнічаў. З сябрамі. Любіў сядзець ля кастроў, пагаманіць, выпіць кілішак. Памятаю, Данута Бічэль-Загнетава заўсёды турбавалася за яго. І гэта яна ў ліпені 1984 году патэлефанавала мне, каб сказаць пра ягоную смерць. Я адразу ж узгадала – у апошні дзень 1983 году, недзе гадзін у адзінаццаць, калі мы ўжо сядзелі за святочным сталом, ён патэлефанаваў мне, павіншаваў з днём народзінаў. Ён добра памятаў, што я нарадзілася акурат на Новы год, і часам жартаваў, як жа дасталася маёй маме. Пагаварылі, а пасля ён сказаў: « Я хацеў Вас павіншаваць, Вольга-Волечка. Можа, апошні раз» і, праз няёмкую паўзу (я неяк не насмелілася пажартаваць, ці ён з'язджае куды) развітаўся. Няўжо прадчуваў сваю хуткую смерць?

Данута расказвала мне, як усё здарылася, і ў яе голасе былі слёзы. Я заплакала разам з ёю. Гэта сапраўды была вялікая страта. Для нас, для ўсёй краіны. Не верылася ў гэтую жорсткую праўду.

Мне і дасюль не верыцца. Здаецца, вось адчыняцца дзверы, і Валодзя, з яго незвычайнай усмешкай, з разумнымі іранічнымі вачыма, пачне «падначваць» мяне, «экзаменуючы» па гісторыі Беларусі. А я – усё яшчэ, як вучаніца, пачну адказваць, каторы раз дзівячыся яго дасведчанасці, яго таленту...

Вольга Іпатава

P.S. Дасылаю Вам і свежы здымак магілы Ул. Караткевіча, на якую мой муж Ягор Фядзюшын сёлета прынёс кветкі, як і заўсёды, калі мы бываем на радзіме. Гэта ягоны здымак.



**On the 85th Anniversary of Uladzimir Karatkevich. By V. Ipatava.**
*(Abstract, magazine “CULTURE, NATION”, September 2015, issue 11, pp. 34-39)*

This year would have turned 85 years of life, one of the most talented Belarusian writers - Uladzimir Sjamjonavich Karatkevich. He was born on November 26, 1930 in Orsha. Vladimir Karatkevich - classic of Belarusian literature, which left its mark in all genres - poetry, prose, drama, journalism, translation. On Wikipedia placed details of life and creation about Karatkevich starting with the origin and childhood, post-war period, years of study and work in Kiev, and the heyday of his talent in Minsk. The most famous his works: Chazenia, The Eye of the Typhoon, From Past Ages, Unforgettable, The Dark Castle Olshansky, King Stakh's Wild Hunt. The following documentaries were created about Karatkevich: 'Was. There. Will', 'Memories' and 'Knight and Servant of Belarus'.

Editors of the magazine 'CULTURE, NATION' puts on their pages the name of U. Karatkevich on the Board of the National Heroes. Belarusian poet and writer V. Ipatava presented the remembrance article about the famous Belarusian.